Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 16 1932 г. № 280 (4532)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Рэзкая крытыка згоды пяці дзяржаў

БЭРЛІН, 13. Жэнэўская згода пяці дзяржаў аб звароце Германіі на канфэрэнцыю па разбраеньні сустракае рэзкую крытыку з боку часткі германскага друку. «Дэйчэ Альгамэйне Цэйтунг» піша: «нават тэарытычная «роўнасьць», прадстаўленая Германіі, па стаўлена ў залежнасьць ад французскага пляну «бясьпекі», супроць якога прадстаўнікі Германіі доўга і ўпарта змагаліся. Газэта ўказвае, што тэкст згоды пяці дзяржаў унікае яснага адказу на пытаньне, ці скасоўваюцца артыкулы Вэрсальскага дагавору, якія трактуюць аб разбраеньні Германіі. Асноўнае заключаецца ў тым, што ўмовы Вэрсальскага дагавору застаюцца для Германіі ў сіле, а таксама, што пасьля дасягнуцьця згоды Германія варочаецца на канфэрэнцыю зусім ня вольнай, як іншыя дзяржавы.

„Ротэ фанэ" зноў на баявым пасту

БЭРЛІН. Пасьля сваёй пяцідзесятай забароны зноў выйшла «Ротэ Фанэ». Буржуазія забараніла ўсе камуністычныя газэты Заходняй Германіі, — піша «Ротэ Фанэ», — каб яны не перашкаджалі ёй «стварыць грамадзянскі волядны мір». Аднак, «Ротэ Фанэ» застаецца на сваім баявым пасту. Яна заяўляе ўсім працоўным, што грамадзянскага міру быць ня можа з ворагамі народу.

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ ЗАГАТОВАК
РАШУЧАЯ ПЕРАСЬЦЯРОГА
З пастановы Бюро ЦК КП(б)Б

Учора на пасяджэньні Бюро ЦК разгледаецца пытаньне аб выкананьні загатоўчых пляноў (па збожжы, ільну, бульбе і мясу). ЦК прызнаў зусім нездавальняючым ход загатовак і прыняў рад важнейшых пастаноў з мэтай узмацненьня тэмпаў выкананьня пляну.

ЦК адзначыў АСАБЛІВА НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ АДСТАВАНЬНЕ ПА АСНОЎНЫХ ВІДАХ ЗАГАТОВАК: ЛОЕЎСКАГА, НАРАЎЛЯНСКАГА, ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА, ЧАЧЭРСКАГА, ПЯТРЫКОЎСКАГА, ЦЕРАХАЎСКАГА, БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА, ГОРАЦКАГА, ТАЛАЧЫНСКАГА, АСЬВЕЙСКАГА І ДУБРОВЕНСКАГА РАЁНАЎ.

ЦК прызнаў, што зусім недапушчальныя тэмпы загатовак у гэтых раёнах зьяўляюцца вынікам апартуністычнай бязьдзейнасьці кіруючых органаў гэтых раёнаў; няўменьня прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі выканаць цьвёрдыя заданьні; няўменьня актывізаваць работу сельсаветаў і камісій садзейнічаньня, ачысьціць іх ад кулацкіх агентаў і сабатажнікаў, мабілізаваць калгасны і бядняцка-серадняцкі актыў; няўменьня па-бальшавіцку мабілізаваць усю партыйную і камсамольскую арганізацыю на выкананьне загатоўчых пляноў і выгнаць са сваіх радоў апартуністычныя элементы—агентуру кулацтва.

Адзначаючы АСАБЛІВА ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ ЛОЕЎСКАГА І НАРАЎЛЯНСКАГА РАЁНАЎ, Бюро ЦК прызнала, што кіраўніцтва гэтых раёнаў ня выканала дырэктыў ЦК і не забясьпечыла прыняцьця неабходных мер для стварэньня рашучага пералому ў ходзе загатовак.

Выходзячы з гэтага Бюро ЦК пастанавіла: ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ САКРАТАРА ЛОЕЎСКАГА РК КП(б)Б ТАВ. БЭДЗРЖЫЦКАГА І СТАРШЫНЮ РВК ТАВ. ШАМЕЦЬКО; САКРАТАРА НАРАЎЛЯНСКАГА РК КП(б)Б Т. БАЛЦІНА І СТАРШЫНЮ РВК Т. КІРСАКА.

Адначасова Бюро ЦК пастанавіла ПРАСЯЦЬ ПРЭЗЫДЫУМ ЦКК У 2-ХДЗЕННЫ ТЭРМІН РАЗГЛЕДЗЕЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ ПРАБЫВАНЬНІ ІХ У ПАРТЫІ.

Кіраўнікоў загатоўчых арганізацый гэтых раёнаў РАДЧЭНКУ, ШЫКУНА І ІНШЫХ ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ І ДАРУЧЫЦЬ ПРАКУРОРУ НЕАДКЛАДНА ПРЫЦЯГНУЦЬ ІХ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

Бюро ЦК пастанавіла таксама ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ З ПЕРАДАЧАЙ СПРАВЫ НА РАЗГЛЕДЖАНЬНЕ ЦКК ДЛЯ ПРЫЦЯГНЕНЬНЯ ДА ПАРТЫЙНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ САКРАТАРА РК КП(б)Б ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА РАЁНУ ТАВ. ШАТУНА І СТАРШЫНЮ РВК ТАВ. ГРЫНКЕВІЧА, А ТАКСАМА СТАРШЫНЮ ЧАЧЭРСКАГА РВК ТАВ. ЧЭШКО ў сувязі з тым, што яны не забясьпечылі выкананьня дырэктыў партыі і ня прынялі неабходных мер для стварэньня рашучага пералому ў ходзе загатовак. Сакратару Чачэрскага РК КП(б)Б тав. ГЕРАЎКЕРУ абвешчана вымова.

Бюро ЦК абвясьціла ВЫМОВУ БЮРО РК КП(б)Б: Лоўскага, Нараўлянскага, Чырвонапольскага і Чачэрскага раёнаў.

Кіраўнікоў загатоўчых арганізацый гэтых раёнаў БОЎСУНА (Загатжывёпа), МЕЛЬНІКАВА І РОБЭРМАНА (Загатзярно) ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ З ПЕРАДАЧАЙ СПРАВЫ ПРАКУРОРУ ДЛЯ ПРЫЦЯГНЕНЬНЯ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

АБВЕШЧАНА ВЫМОВА І ПАПЯРЭДЖАНА АБ ДАДАТКОВЫМ РАЗГЛЯДЗЕ ПЫТАНЬНЯ ў выпадку не забясьпячэньня пералому ў загатоўках: САКРАТАРАМ РК І СТАРШЫНЯМ РВК НАСТУПНЫХ РАЁНАЎ: ПЯТРЫКОЎСКАГА (т. т. МАНЖАЛЕЮ І МАЦКЕВІЧУ), Церахаўскага (т. т. СУРБА І ДУПАНАВУ) Буда-Кашалеўскага (т. т. СМОРЧАНКА і СТРЭЙКІС), Горацкага (т. КАНДРАЛЮ), Асьвейскага (т. т. СЬЦЕФАНОВІЧУ і АДАМЕНКО), Талачынскага (тав. ЛАГЕРАВУ) і Дубровенскага (т. т. КАШМАНУ і БАГДАНАВУ).

Кіраўнікам загатоўчых арганізацый гэтых раёнаў абвешчана СУРОВАЯ ВЫМОВА.

Бюро ЦК у сваёй пастанове ўказала КІРАЎНІКАМ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ — Загатзярно—т. Нуромскаму, Загатлён—т. Шэйніну, Загатжывёла—т. РАШАЛУ, што дрэнны ход загатовак знаходзіцца ў простай залежнасьці АД НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ РАБОТЫ ЗАГАТОЎЧАГА АПАРАТУ ЯК У ЦЭНТРЫ, ТАК І НА МЯСЦОХ І ПАПЯРЭДЗІЛА, ШТО ЯНЫ ЦАЛКАМ НЯСУЦЬ АЛКАЗНАСЬЦЬ ЗА ДАЛЕЙШЫ ХОД ЗАГАТОВАК.

ДА V ЗЬЕЗДУ ПРАМКААПЭРАЦЫІ

Сёньня адкрываецца V усебеларускі зьезд прамкаапэрацыі. Значэньне зьезду заключаецца ў тым, што ён падвядзе першыя вынікі перабудовы работы прамкаапэрацыі на аснове апошніх дырэктыў партыі і ўраду.

З якімі канкрэтнымі паказальнікамі прыходзіць прамкаапэрацыя да свайго зьезду? Перш за ўсё, карэнным чынам рэарганізавана арганізацыйная структура. Былыя ўніверсальныя райпрамсаюзы, якія ня толькі не спраўлялися кіраваць вытворчасьцю, але і вялі лішнім цяжарам на плячох арцеляй, зараз зусім ліквідаваны. На лініі тэкстыльна-швейных і скурабутковых промыслаў, як найбольш буйных на ўсёй сыстэме прамкаапэрацыі, замест былых цэнтральных аб'яднаньняў арганізаваны галінныя міжраённыя прамсаюзы.

Такая перабудова арганізацыйнай структуры значна канкрэтызавала кіраўніцтва пазавым вытворчым зьвяном, вызваліла яго ад празьмернай цэнтралізаванасьці і вялікіх накладных выдатваў.

Другі вельмі важны момант перабудовы—гэта ўмацаваньне арцелі, прадастаўленьне ёй самастойнасьці ў разьвіцьці ўласнай ініцыятывы. Самастойная загатоўка сырцу і збыт выробленай з яго прадукцыі далі магчымасьць арцелі значна пашырыць сваю вытворчасьць шляхам вышукваньня, мабілізацыі і выкарыстаньня мясцовых рэсурсаў.

Рост валавой прадукцыі і тавараабароту—найлепшыя паказальнікі ў гэтых адносінах. **Калі ў першым квартале 1932 г. усёй сыстэмай прамкаапэрацыі было выпушчана прадукцыі на 31 млн. 837 тыс., а ў другім на 33 млн. 358 тыс., то ўжо ў трэцім—на 35 млн. 715 тыс. У адным толькі кастрычніку было выпушчана прадукцыі на 12 млн. 293 тыс. руб.**

Асабліва важна адзначыць рост выпуску прадукцыі шырокажытку. Так, у ліпені было выпушчана на 5 млн. 859 тыс., у жніўні—на 7 млн. 100 тыс., верасьні—на 7 млн. 11 тыс., кастрычніку—7 млн. 882 тыс., лістападзе—8 млн. 239 тыс. **А ўсяго за 11 месяцаў бягучага году—на 85 млн. 3 тыс., што складае 59,9 проц. валавой прадукцыі.**

Тавараабарот таксама расьце з кварталу ў квартал. На 1 красавіка ён складаў 2 млн. 778 тыс., на 1 ліпеня—4 млн. 827 тыс., на 1 кастрычніка—5 млн. 765 тыс. За два месяцы чацьвертага кварталу—3 млн. 191 тыс. **Зараз па ўсёй сыстэме налічваецца 80 магазынаў і больш 100 ларкоў раздробнага продажу.**

Значна ўзрасла і колькасьць каапэраваных саматужнікаў. На 1 студзеня 1932 г. было 34.528 членаў арцеляй, на 1 лістапада—35.364.

Калі да ўсяго гэтага дадаць факт выкананьня прамкаапэрацыяй пяцігадовага пляну па выпуску валавой прадукцыі на 101 проц., то посьпехі яе разьвіцьця, асабліва за апошнія 4-5 месяцаў у сувязі з перабудовай работы, відавочныя. Але ці азначае гэта, што прамкаапэрацыя ўжо цалкам перабудавала сваю работу, што ў гэтых адносінах зроблена ўсё неабходнае?

Такі вывад быў-бы самаашуканствам. Адзначаючы вялізарныя зрухі ў разьвіцьці ўласнай ініцыятывы арцелі, трэба мець на ўвазе, што **гэта толькі пачатак,** што вялікая частка арцеляй далёка няпоўнасьцю выкарыстоўваюць даныя ім правы ў гэтых адносінах.

Незадавальняюча арганізавана бытавое абслугоўваньне арцельшчыкаў. Вельмі малая частка арцеляй мае ўласныя сталовыя, адкормачныя пункты і іншыя дапаможныя гаспадаркі.

Арганізацыя працы і яе аплаты ўнутры арцеляй таксама не на належнай вышыні. Абязьлічка і ўраўнілаўка ўсё яшчэ моцна даюць сабе адчуваць.

Усё гэта разам узятае ня можа не адбівацца на выкананьні вытворчай праграмы. Як вынік, дзесяцімесячны агульны плян чацьвертага заключнага выкананы толькі на **78,5 проц., па шырспажыву (адзінаццацімесячны)—на 89,5 проц.**

Якасьць—адно з вузкіх месц работы прамкаапэрацыі. Мала таго, што па мноства рэчы цэны высокія. Якасьць прадукцыі яшчэ далёка незадавальняючая, асабліва па рамонтных апэрацыях.

Задача зьезду—ня толькі падвесьці вынікі папярэдняй работы, але і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшай перабудове, мабілізаваць масы арцельшчыкаў на пасьпяховае зьнішчэньне ўсіх недахопаў, на выкананьне і перавыкананьне намечаных вытворчых пляноў.

Асноўная ўвага павінна быць накіравана на яшчэ большае ўмацаваньне вытворчага зьвяна—арцелі, на яшчэ большае разьвіцьцё яе ўласнай ініцыятывы. У гэтым заруках пасьпяховай перабудовы работы прамкаапэрацыі і баявой падрыхтоўкі да другой пяцігодкі.

15.000 ТОН МЯСА—ДА 25 СЬНЕЖНЯ

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па дакладу «Загатжывёпы» адзначыў незадавальняючае выкананьне пляну мясазагатовак.

У выніку несвачасовага дазядзеньня абавязацельстваў па здачы мяса да дзвароў калгасьнікаў і аднаасобнікаў, у выніку дэмабілізацыйных настрояў на гэтым участку—«раз заданьні па мясу маюць сёю-тую пазатэму—значыць ніякая арганізацыя загатовак непатрэбна»,—плян мясазагатовак чацьвертага кварталу выкананы на 10 сьнежня толькі на 52,9 проц. На працягу кварталу трэба загатовіць 15.000 тон, загатоўлена толькі 8,4 тыс.

Толькі малочна-тварожныя формы перавыкананы свае заданьні—108,4 проц. Адстаюць ПКФ, здаўшыя 91,7 проц. Саўгасы розных выстаў ня ўжылі рашучых мер, каб фарсаваць загатоўкі, ня выканалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Саўгасы Сьвінаводтрэсту, прыклад, да 10 сьнежня здалі толькі 64 проц. пляну чацьвертага кварталу.

Асабліва дрэнная абстаўка з загатоўкамі ня па індывідуальных гаспадарках калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Гэта самы адсталы участак кампаніі. Калгасьнікі здалі 14 проц. пляну, аднаасобнікі—40 проц. Тут у поўнай мары адбілася адсутнасьць масава-растлумачальнай работы серод працоўных сялян, зусім слабы націск на кулака. Тут самы адмоўны ўплыў мела непаслядоўная значэньня масавай работы ў мясазагатовках, упоўнасьць, што «вы везуць» адміністрацыйныя [illegible] ды ўзьдзейнасьці, прадугледжаныя дзяр[illegible]рты і ўраду. Ёсьць раёны, як напрыклад, Дубровенскі, Чачэрскі, Гомельскі, Вушацкі, Церахаўкі, Рэчыцкі, якія здалі ад 15 да 20 проц. пляну чацьвертага кварталу. Іх работа наглядна сьведчыць аб няўменьні арганізаваць мясазагатоўкі.

Пленум ЦК КП(б)Б прапануе ўсім раённым і загатоўчым арганізацыям прыняць неадкладныя меры для выкананьня пляну чацьвертага кварталу да 25 сьнежня. Пленум пад крэсьлі абсалютную недапушчальнасьць найменшага разбазараньня таварнай мясной прадукцыі, кваліфікуючы гэта, як раскраданьне сацыялістычнай маемасьці.

Пленум завастрыў увагу ўсіх арганізацый на неабходнасьці разгортваньня масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцкой і серадняцкой—аднаасобнікаў. У цэнтры яе трэба паставіць папулярызацыю пункту дэкрэту аб тым, што толькі тыя калгасьнікі і аднаасобнікі, якія акуратна выконваюць заданьні, маюць права забіваць жывёлу і свабодна прадаваць мяса на рынку. У адносінах тых, хто ўхіляецца ад своячасовай здачы мяса, павінны ўжывацца жорсткія меры ўзьдзейнасьці, прадугледжаныя законам.

Дырэктыву пленуму ЦК трэба ажыцьцявіць поўнасьцю і ў самы кароткі тэрмін.

Да 25 сьнежня БССР павінна здаць 15.000 тон мяса. Гэтага патрабуюць задачы забясьпячэньня асноўным прадуктам харчаваньня пралетарскіх цэнтраў, адбудоўлі і Чырвонай арміі.

Перамогу ў барацьбе за збожжа вырашае
бальшавіцкая арганізацыя мас супроць кулацкага супраціўленьня

„... Трэба памятаць, што калгасамі, якімі мы ня кіруем, кіруюць варожыя нам антысавецкія элемэнты" (В. МОЛАТАУ)

Ход загатовак збожжа па БССР
У процантах да гадзвога пляну на 10 сьнежня 1932 г.

Назва раёну	Усяго здана (разам з насенпазычкай)	Загатоўлена
1. Тураўскі	110,9	101,0
2. Жыткавіцкі	102,1	100,0
3. Камарынскі	95,0	104,5
4. Вуазьдзейскі	95,7	95,7
5. Лельчыцкі	86,6	102,7
6. Стара-Дароскі	85,5	86,7
7. Ельскі	82,7	89,0
8. Слуцкі	82,0	83,1
9. Бярэзінскі	80,1	88,4
10. Любаньскі	78,1	78,1
11. Чырвонаслабодзкі	77,4	77,4
12. Асіповіцкі	77,2	81,5
13. Менскі	77,1	86,8
14. Старобінскі	76,9	80,4
15. Капыльскі	72,6	77,5
16. Пухавіцкі	71,7	71,8
17. Чэрвеньскі	70,7	73,1
18. Парыцкі	70,6	77,3
19. Заслаўскі	70,0	74,0
20. Бабруйскі	69,6	71,3
21. Віцебскі	68,4	72,5
22. Барысаўскі	68,3	62,3
23. Мсьціслаўскі	67,7	66,7
24. Брагінскі	66,3	67,0
25. Плешчаніцкі	65,8	67,2
26. Лагойскі	65,6	68,9
27. Маязырскі	63,9	79,0
28. Глускі	63,3	71,0
29. Рагачоўскі	62,5	64,4
30. Касьцюковіцкі	62,3	68,7
31. Бешанковіцкі	66,2	67,2
32. Полацкі	61,9	65,2
33. Веткаўскі	61,8	62,0
34. Чэрыкаўскі	60,5	71,6
35. Шклоўскі	60,2	70,8
36. Аршанскі	60,2	62,5
37. Гарадоцкі	60,1	69,0
38. Сіроцінскі	59,4	72,2
39. Вягомльскі	59,0	72,2
40. Дубровенскі	57,3	59,5
41. Дзяржынскі	57,2	66,0
42. Дрысенскі	56,9	73,3
43. Клімавіцкі	56,9	63,8
44. Клічаўскі	55,4	57,5
45. Расонскі	54,9	66,0
46. Смалявіцкі	54,3	77,7
47. Магілеўскі	54,3	60,6
48. Сураскі	53,8	65,6
49. Жлобінскі	53,4	53,8
50. Бялыніцкі	53,3	57,0
51. Сенненскі	52,6	60,5
52. Быхаўскі	52,6	55,5
53. Вушацкі	51,1	53,8
54. Церахаўск.	50,2	55,2
55. Лёзьнянскі	48,9	58,6
56. Клічаўскі	48,3	56,1
57. Талачынскі	48,0	51,1
58. Нараўлянскі	47,8	61,5
59. Уваравіцкі	46,7	48,0
60. Гомельскі	46,6	54,9
61. Пятрыкоўскі	46,2	61,5
62. Хойніцкі	45,4	49,5
63. Чашніцкі	45,1	45,1
64. Чавускі	44,5	47,3
65. Чачэрскі	44,2	51,8
66. Лепельскі	44,2	48,6
67. Лоеўскі	43,0	50,9
68. Буда-Кашалеўскі	42,6	49,3
69. Прапойскі	42,5	42,8
70. Кармянскі	41,6	44,1
71. Асьвейскі	40,8	89,2
72. Рэчыцкі	39,9	56,3
73. Крупскі	39,6	59,2
74. Горацкі	37,2	42,6
75. Чырвонапольскі	35,9	42,0
Разам па БССР:	60,2	66,7

ПЕРАДАВІКІ

Наступныя раёны па-ўдарнаму змагаюцца за выкананьне пляну збожжазагатовак і паказваюць узорныя тэмпы работы. Як перадавікоў збожжазагатовак, мы заносім іх на чырвоную дошку.

1. **ТУРАЎСКІ** раён—выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 101,0 проц., разам з насенпазыкай — 110,9 проц. заданьня.
2. **ЖЫТКАВІЦКІ** раён — здаў 100,0 проц. заданьня па збожжы, разам з насенпазыкай выканаў 102,1 проц. агульнага пляну.
3. **КАМАРЫНСКІ** раён — выканаў плян збожжазагатовак на 104,5 проц., разам з насенпазыкай — 98,0 проц.
4. **ВУЗЬДЗЕНСКІ** раён набліжаецца да поўнага ажыцьцяўленьня гадавога заданьня, здаўшы да 10 сьнежня 95,7 проц. пляну (разам з насенпазыкай).

Чорная дошка

За дрэнную арганізацыю загатовак, за няўменьне мабілізаваць масы калгаснага і бядняцка-серадняцкага сялянства па барацьбу за збожжа і адсутнасьць рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, пакідаем і дадаткова заносім на чорную дошку наступныя раёны:

1. **Чырвонапольскі** — выканаў 35,9 проц. гадавога пляну; 2. **Горацкі** — 37,2 проц; 3. **Крупскі** — 39,6 проц.; 4. **Рэчыцкі** — 39,9 проц.; 5. Кармянскі — 41,6 проц.; 6. **Прапойскі** — 42,5 проц.; 7. **Буда-Кашалеўскі** — 42,6 проц.; 8. **Лоеўскі** — 43,0 проц.; 9. **Лепельскі** — 44,2 проц.; 10. **Чачэрскі** — 44,2 проц.; 11. **Чавускі** — 44,5 проц.

Чыю справу робіць Мельнікаў

ЧАВУСЫ. Выкананьне пляну збожжазагатовак па Дзядзіняўскім сельсавеце ідзе вельмі дрэнна.

Кіраўніцтва сельсавету ніякай масавай работы сярод працоўных аднаасобнікаў не праводзіць. Упаўнаважаны РК і РВК **Мельнікаў** замест дапамогі сельсавету ў яго рабоце палохае сялян рознымі адміністрацыйнымі мерамі, робіць вобыскі ў серадняковай і бядняковай і забірае збожжа і бульбу. У той-жа час ён патурае сваяком-заможнікам.

Браты Мельнікава Лэрка і Малах нічога не здалі па ўсіх відах загатовак.

Стрэчны брат Мельнікава Кірэнка Васіль атрымаў цьвёрдае заданьне, але-ж ён стават і ня думае яго выконваць. Накладзены на яго штраф у суме 250 руб. і на сёньняшні дзень не сплочаны. У гэтым годзе ён заставаў ад абкладаньня адну карову.

Мельнікаў займаецца ўвесь час папойкамі са сваімі сваякамі і ніякай работы па загатоўках не праводзіць.

Чавускія раённыя арганізацыі павінны зацікавіцца «дзейнасьцю» свайго ўпаўнаважанага.

ШПІЛЬКА.

Зьмена кіраўніцтва забясьпечыла пералом

ЕЛЬСК. План збожжазагатовак па раёне выкананы на 82,7 проц. Калгасы здалі 103 проц. пляну, аднаасобныя сэктар—86,2 проц. **Ельскі, Кармянскі, Калашчанскі** сельсаветы перавыканалі ўжо свае заданьні. Мялешкавіцкі сельсавет, які ўвесь час адставаў, пасьля зьмены кіраўніцтва выканаў плян на 103,4 проц.

Райком партыі даў жорсткі адпор апартуністычным разлажаньням былых кіраўнікоў гэтага сельсавету. Сакратар ячэйкі **Казінцоў** зьнят з работы. Брыгада РК і РВК, накіраваная на дапамогу сельсавету, пры актыўным удзеле мясцовага актыву разгарнула шырокую масавую работу сярод бядняковай і серадняковай—аднаасобнікаў. У выніку гэтага плян па збожжазагатоўках перавыкананы.

Асабліва адстаючымі сельсаветамі зьяўляюцца Сатонкаўскі, Каменскі і Рамізоўскі. Старшыня Рамізоўскага сельсавету **Лукноўскі**, замест мабілізацыі актыву і правядзіцьцяй яго расстаноўкі на вучастках, апусьціў рукі: «Мне не разарвацца».

Кіраўнікі гэтых сельсаветаў жывуць у згодзе з кулакамі. Цьвёрдых заданьняў сплачана ўсяго 50 проц.

ЕЛЬСКІ.

Кулацкі „агітпроп" за работай

ТАЛАЧЫН. (Наш спэц. кар.).

Ня дзіўна, што **Сакалінскі** сельсавет зьяўляецца самым адсталым у раёне па збожжазагатоўках. Самі кіраўнікі ня выконваюць сваіх заданьняў.

На 13 сьнежня плян па сельсавету выкананы на 34,5 проц. Калгасы здалі 65 проц. заданьня, аднаасобнікі—29,4 проц.

Старшыня сельсавету, кандыдат партыі **Зянько Клім** у парадку самаабавязацельства павінен здаць тры пуды аўса і 50 пудоў бульбы. Аднак, ён ня здаў яшчэ ні адзінага кілёграма. Па ім раўняюцца ўсе члены сельсавету і камісіі садзейнасьці. Ну, а за ім і іншыя.

Зянько агітуе сялян, каб яны ня выконвалі сваіх заданьняў, бо ўрад, быццам хутка выпасьць новую пастанову, якая зьмяншыць плян загатовак.

Старшыня сельсавету—асоба аўтарытэтная. Як-жа ня верыць свайму кіраўніку? Сяляне Сакалінскага сельсавету збожжа не здаюць і чакаюць новага дэкрэту...

Кіраўніцтва Сакалінскага сельсавету павінна быць зараз-жа адноўлена. Кулацкаму агенту Зянько ня месца ў радах партыі. **Л. К.**

Да 1 студзеня выканаць 80 проц. пляну ільназагатовак
ІЛЬГОТЫ ІЛЬНАЗДАТЧЫКАМ НЕ СКАРЫСТАНЫ
ЗБОЖЖА І ПРАМТАВАРЫ—ТОЛЬКІ ТЫМ КАЛГАСЬНІКАМ, ЯКІЯ СВАЯЧАСОВА ВЫКОНВАЮЦЬ ПЛЯН

Дырэктывы аб ільготах парушаюцца

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б паставіў перад усёй партыйнай арганізацыяй важнейшую задачу — да 20 сьнежня па асноўных ільнаводчых раёнах выканаць ня менш 70 проц. гадавога пляну ільназагатовак, а па іншых раёнах ня менш 90 проц.

З пачатку ільназагатоўчай кампаніі прайшло ўжо больш 2-х месяцаў — тэрмін зусім выстарчальны для сапраўднага разгортваньня загатовак тэхнічных культур. Ня зруху яшчэ няма, нахадварот за апошнія 5 дзён тэмпы ільназагатовак знізіліся. Рэспубліканскі плян выкананы на 27,8 проц. Апошняя пяцідзеўка дала 1,8 проц. прыросту замест 2,8 проц. у папярэднія пяць дзён. Калгасы МТС здалі 27 проц. ільнавалакна, іншыя калгасы — 34,5 проц., аднаасобнікі — 20,3 проц. і цьвёрдазаданьнікі — 13,8 проц.

Ільнаводчыя раёны па сваёй удзельнай вазе займаюць у плане ільназагатовак пераважнае месца. Гэтыя раёны павінны здаць 75 проц. ільнянай прадукцыі, а фактычна — яны здалі толькі 27,1 проц.

Вось ужо некалькі пяцідзевак, як адзін з асноўных ільнаводчых раёнаў — **Асьвейскі**, топчыцца на адным месцы. У радзе калгасаў Асьвейшчыны траста знаходзіцца пад сьнегам. Такія-ж факты наглядаюцца і ў **Дрысенскім** раёне.

Побач з такімі раёнамі, як **Ельскі, Рагачоўскі і Тураўскі**, якія выканалі гадавы плян ад 61 проц. да 73 проц. ёсьць і такія раёны, якія не загатовілі і 5 проц. валакна. **(Чырвона-Слабодзкі, Пятрыкоўскі, Парыцкі і Бярэзінскі).**

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР калгасьнікам, занятым па насеве, уборцы і перапрацоўцы ільну вызначаны пераважныя ільготы. 10 проц. ільну з фактычна атрыманага ўраджаю пасьля выкананьня ільназагатовак калгасы павінны разьмяркаваць па працаднёў сярод калгасьнікаў, занятых на апрацоўцы ільну. Пасьля выкананьня збожжазагатовак 20—30 проц. збожжавага фонду павінны атрымаць тыя калгасьнікі, якія працуюць на ільне. Апрача гэтага, за добраякаснае валакно калгасы атрымліваюць ад дзяржавы збожжа і прамтавары. Гэта збожжа і прамтавары павінны быць разьмяркаваны паміж калгасьнікамі, якія сеялі, убіралі лён і зараз працуюць на мяльна-сушыльным пункце. Ці скарыстаны раённымі арганізацыямі гэтыя магутныя вагары для мабілізацыі актыўнасьці калгасьнікаў для апрацоўкі ільну.

У Крычаўскім раёне ў калгасах Падзілкаўскага і Луначарскага сельсаветаў прамтавары разьмеркаваны сярод усіх калгасьнікаў. У гэтым-жа раёне збожжа, атрыманае для стымулявання ільназагатовак, па пастанове бюро РК было залічана ў пасеўную пазыку. У іншых раёнах гэтыя вагары для стымулявання ільназагатовак таксама не скарыстаны.

Вінаватыя ў парушэньні дырэктыў аб ільготах ільназдатчыкам павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Пусьціць у ход усе вагары, мабілізаваць на апрацоўку і здачу ільну ўвесь партыйны, камсамольскі і калгасны актыў, на працягу бліжэйшых дзён дабіцца карэннага пералому — вось задача раённых партарганізацый.

Лёзьнянская МТС—кандыдат на прэміяваньне

ЛЁЗНА, 14. (БелТА). Лёзьнянская МТС моцна трымае пераходны сьцяг ЦО КП(б)Б газ. «ЗЬВЯЗДА». На ўсіх этапах барацьбы за тэхкультуры, МТС ідзе ў авангардзе.

Ільназагатоўкі па калгасах на 10 сьнежня выкананы на 91 проц. да раённага пляну і на 96.2 проц. да пляну Трактарацэнтру. 46 калгасаў МТС поўнасьцю выканалі свае заданьні. Усе іншыя калгасы ў бліжэйшыя дні канчаюць апрацоўку і здачу ільну дзяржаве.

РАЗМОВЫ З АГАВОРАЧКАМІ

ПОЛАЦАК. (Наш спэцкор.).

Ветрынская МТС добра справілася з сяўбой у гэтым годзе. Як перадавік, яна прэміявана.

Чым жа тлумачыцца, што калгасы МТС надзвычай адстаюць у справе пераапрацоўкі і загатовак ільну?

Загадчыкі вытворчых вучасткаў МТС у адзін голас заяўляюць:

— Што-ж ты зробіш, не нарасло валакно. Спачатку прымачыла, потым засушыла, прыпякло. Лён вырас, але няма «рубашкі».

Выходзіць, вінавата прырода: дажджы, сонцапёкі. «Аб'ектыўныя прычыны», улясьцівыя апартуністам.

Сапраўдныя-ж прычыны ў тым, што ні парт'ячэйка, ні дырэкцыя МТС, ні кіраўнікі вытворчых вучасткаў, ні праўленьні калгасаў не мабілізавалі калгасныя масы на датэрміновае выкананьне пляну па пераапрацоўцы і загатоўках ільну, не разагрулі па літычна-растлумачальнай работы.

Наадварот, знаходзяцца аматары голага адміністраваньня. Возьмем загадчыка Астроў шчынскага вытворчага вучастку, агранома **Гарбука.** Яго думка такая:

— Траба прыйсьці ў калгас і сказаць: «Пакуль ня вывезем трасту, не здасі на ільназавод, — душа з цябе вон. Усяць падпіску. Не здаюць—зрабіць «праверку» (вобыск)».

Чаго варты такія «мэтады» голага адміністраваньня? Яны граюць на руку толькі клясаваму ворагу — кулаку, які імкнецца сарваць ільназагатоўкі.

Ветрынская МТС, як вытворчыя вучасткі адкладвалі ільназагатоўкі да «скончэньня малацьбы, да лепшай дароги, да выкананьня пляну бульбазагатовак. Лён ставіўся ў апошнюю чаргу.

Паводле пляну, калгасы Ветрынскай МТС павінны былі здаваць лён трастой на Ветрынскі ільназавод. Да ручной пераапрацоўкі не рыхтаваліся. Мялкі, у значнай колькасьці складаныя, стаялі.

Зараз выявілася, што ў многіх калгасах траста зусім нізкай якасьці, на ільназавод яе ня прымаюць. Прыходзіцца пераапрацоўваць рукамі. А аб ручной пераапрацоўцы загаварылі толькі ў пачатку сьнежня. Загаварылі са спазьненьнем роўна на... тры месяцы.

Аднак і зараз ідуць толькі размовы, прычым з агаворачкамі:

— У калгасах «Новы мір» і «Сацыялізм» не хапіла ільну для выкананьня пляну. Засталося на тоне ці крыху больш трасты. Не нарасло валакно, — гаворыць вучасткоў агранам **Ісакаў.**

— У калгасе «Перамога» пералежала траста, у «Ідэале» — няўроч, лён замыт вадой, прысьцёбнут засухай,—уторыць Ісакаву агранам тав. **Якубенка.**

Як ня круці, а плян выкананы нельга, — такі вывад робяць працаўнікі МТС.

Дырэктар МТС тав. **Суднік** глядзіць на справу інакш. Ён ведае, што ў асобных калгасах ёсьць тэндэнцыя захаваць лён, ухіліцца ад выкананьня пляну загатовак; ён прыводзіць прыклады з летаўшняй практыкі, калі ў разгар кампаніі там і сям крычалі «няма ільну», а зімой і над вясну гулі пралёты бесьперапынку, значная частка ільну асела ў калгасах; ён ведае, што шмат якія старшыні калгасаў праводзяць такую «лінію»:

— Хай зараз палаюць за невыкананьне пляну, затое калгасьнікі пахваляць і на «розныя патрэбы» застанецца тона—другая траста.

Шмат чаго ведае тав. Суднік, але... ільназагатоўкі стаяць на месцы. І будуць стаяць, калі ад размоў з агаворачкамі МТС не пройдзе да канкрэтнай практычнай работы па арганізацыі пераапрацоўкі ільну і здачы (продажу) ільнапрадукцыі дзяржаве.

Ветрынская МТС можа і абавязана выканаць плян ільназагатовак у бліжэйшыя дні.

З в о д к а
аб ходзе ільназагатовак па ільнаводчых раёнах БССР на 10 сьнежня

| №

КАНФЛІКТ ПАМІЖ ГЕРМАНСКІМ УРАДАМ І РЭЙХСТАГАМ

БЭРЛІН, 14. Паміж урадам і большасьцю рэйхстагу выбухнуў буйны канфлікт з поваду пастановы бюджэтнай камісіі. Урад заявіў аб сваёй гатоўнасьці скасаваць загад Папэна ад 5 верасьня пра скарачэньне зарплаты і такім чынам з 1 студзеня ўступаюць у моц ранейшыя тарыфныя стаўкі. Гэта адступленьне вынікае арганізаванага кампартыяй і рэвалюцыйнай прафапазыцыяй супраціўленьня рабочых мае супроць грабяжу зарплаты. Урад баіцца новай забастовачнай хвалі, якая-б яшчэ больш абвастрыла ўнутраную палітычнае становішча. Разам з гэтым, гэта ўступка робіцца і для таго, каб дань прафсаюзам асноўу для іх палітыкі падтрыманьня ўраду.

Далей на аснове прапановы камуністаў бюджэтная камісія пастанавіла галасамі камуністаў, сацыял-дэмакратаў і нацыянал-сацыялістаў скасаваць дэкрэт Папэна ад 14 ліпеня, які скарачае дапамогу беспрацоўным. Урад заявіў, што гэту пастанову нельга выконаць і ўрадавы друк дае зразумець, што падобнага роду пастановы могуць прывесьці да роспуску рэйхстагу. «Дэйчэ Альгемэйне Цэйтунг» пытае: «Ці мае намер рэйхстаг зрабіць самазабойства?»

Камфракцыя рэйхстагу патрабуе скліканьня пленуму рэйхстагу

БЭРЛІН. Старшыня камфракцыі рэйхстагу **Торглер** перадаў старшыні рэйхстагу патра баваньне камфракцыі аб скліканьні пленуму рэйхстагу на 19 сьнежня. Камфракцыяй запрапанаван наступны парадак дня: **справаздача па рашэньні бюджэтнай камісіі** аб зімовай дапамозе беспрацоўным, аб скасаваньні надзвычайнага дэкрэту і абгаварэньне вотуму недавер'я ўраду Шлейхэра унесенага камфракцыяй.

VI ЗЬЕЗД КАМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 13 сьнежня. «**Інпрэкор**» друкуе паведамленьне аб VI зьезьдзе кампартыі Польшчы. У паведамленьні гаворыцца:

«У лістападзе бягучага году адбыўся ў Веве VI зьезд кампартыі Польшчы. На зьезьдзе былі прадстаўлены амаль усе акруговыя арганізацыі. У рабоце зьезду прынялі ўдзел 59 дэлегатаў, сярод іх 33 дэлегаты (28 рабочых) з пастаноўчым голасам. Сярэдні партыйны стаж прадстаўнікоў акруг — 7 год 5 мес. Сярэдні турэмны стаж — 1 год 7 месяцаў.

Выходзячы з ацэнкі і пастаноў XII пленуму ВККІ, зьезд даў грунтоўны аналіз міжнароднага і ўнутранога становішча Польшчы, намеціў рэвалюцыйную перспэктыву, выявіў сур'ёзныя дасягненьні партыі, павёў посьлядоўную самакрытыку яе памылак і слабасьцяй, вызначыў тактычныя і арганізацыйныя задачы партыі ў цяперашні момант рэвалюцыйнага ўздыму Польшчы.

У цэнтры зьезданьскай дыскусіі па дакладу ЦК сталі пытаньні ўзьнікньня акрыўшасьці партыі, заваяваньня кіруючай ролі на ўсіх вучастках рэвалюцыйнага фронту, выкрыцьця на вопыце штодзённай барацьбы «левых» маньўраў сацыял-фашызму, дакладнага падрыву і ліквідацыі базы сацыял-фашысцкіх і кулацкіх партый, мэтадаў антываеннай кампаніі, узмацненьня работы ў арміі, умацаваньня партыі на буйных прадпрыемствах, разьвіцьця рэвалюцыйнага прафруху, нарэшце, палепшэньня сыстэмы кіраўніцтва за ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму і шалейшага фашысцкага тэрору.

Зьезд спэцыяльна заняўся нацыянальным пытаньнем, асабліва выяўленьнем такты кі партыі ў нацыянальна-вызваленчым руху на Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Зьезд прыняў праграму партыі, якая, грунтуючыся на праграме Кэмінтэрну, дае харак тарыстыку разьвіцьця польскага капіталізму і фашызму, рухаючых сіл і задач сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы, стратэгіі і тактыкі кампартыі Польшчы ў барацьбе за дыктатуру пралетарыяту.

Зьезд выбраў новы склад ЦК, узмацніўшы яго рабочае ядро.

Зьезд яку адмацуўшы адпор вылазкам групы трацкістаў. Асноўнае ядро гэтай групы склалася з членаў былой групы Кастржэвы. Зьезд закляймёў рэнэгацкую, контр-рэвалюцыйную дзейнасьць гэтай групы, якая зьяўляецца агентурай сацыял-фашызму і дзейнічае на руку ахранцы Пілсудзкага.

Зьезд выявіў бальшавіцкую згуртаванасьць партыі, аб'яднанай вакол ЦК. Работа ЦК была аднагалосна ўхвалена зьездам.

Ядказ пэрсыдзкага ўраду на ангельскую ноту

ЛЁНДАН, 14. Адказ пэрсыдзкага ўраду на ангельскую ноту ад 2 сьнежня падае рад аргумэнтаў у карысьць ануляваньня канцэсіі «Англо Першын», самы галоўны з іх наступны: дагавор канцэсіі быў заключан пад націскам Англіі, сума плацяжоў пэрсыдзкаму ўраду вылічвалася няправільна, прадстаўніком Пэрсіі не дазвалялася кантраляваць разхункаў кампаніі, кампанія ня ўносіла плацяжоў у часе вайны і адмовілася ўплачваць падаходны падатак. Пэрсыдзкі ўрад лічыць, што ён меў права ануляваць канцэсію, і ня бачыць прычын для скасоўваньня свайго рашэньня.

Пэрсыдзкі ўрад ня лічыць, што ён павінен прыняць рашэньне міжнароднага Гаагскага трыбуналу, паколькі апошні ня можа разглядаць канфлікту паміж урадам з аднаго боку, і камэрцыйным прадпрыемствам, з другога. Пэрсыдзкі ўрад адмаўляецца прызнаць свае адказнасьць за страты, панесеныя кампаніяй, паколькі ён ніколі ня прымаў удзелу ў дзейнасьці кампаніі. Ён шкадуе, што ня можа пачаць перагавораў з «Англо-Першыем» з прычыны пятражаючай пазыцыі ангельскага ўраду шкадуе, што ангельскі ўрад шляхам націску на пэрсыдзкі ўрад пабуджае кампанію далей аказваць супраціўлень не жаданьням Пэрсіі. Пэрсыдзкі ўрад лічыць, што ён мае права інфармаваць раду Лігі нацый аб націску і пагрозах ангельскага ўраду.

НАМІТЭТ 19-ці Ў ТУПІКУ

ЖЭНЭВА, 13. Палітычна падзеньнем у даны момант у Жэнэве зьяўляецца насьледканьне камітэту 19-ці. Камітэту прадстаіць вырашыць тры задачы: першая — ухіліцца наогул ад выпрацоўкі праекту рэзалюцыі, другая — калі ня ўдасца ухіліцца ад выпрацоўкі рэзалюцыі, дык зрабіць яе даволі бесказарокай і пакідаючай усё пытаньне адкрытым, трэцяя — выкінуць пытаньне аб запрашэньні ПАЗШ і СССР. Як відаць, зусім ухіліцца ад якой-бы там ні было рэзалюцыі ня ўдасца.

Гэта жагчымасьць значна звужана, дзякуючы таму, што дакład Літона фармальна ўжо прайшоў як праз раду, так і праз пленум Лігі і зусім ухіліцца ад вынясьньня ні камітэту, ні пленуму ня ўдасца.

Учарайшыя спрэчкі ў камітэце 19-ці выкрылі сур'ёзныя разгалосьі. Большасьць камітэту выказалася наогул у карысьць асноўных ліній так званай рэзалюцыі 4-х (Гішпанія, Чэха-Славакія, Швэцыя, Ірляндыя). Гэтыя лініі заключаюцца ў прыняцьці першых васьмі частак дакладу Літона (агул фактаў) і ў заключэньні дэкларацыі — аб непрызнаньні Манчжоу-Го. Што датычыць простага абгаварэньня дзеяньняў Японіі, то ў гэтым пытаньні паваг самі аўтары рэзалюцыі 4-х, як відаць, уступіць. Аднак, супроць простай фармулёўкі непрызнаньня Манчжоу-Го выступіў Саймон, які настойваў у якасьці максымуму на паўтарэньні рэзалюцыі ад 11 сакавіка, у якой заяўлялася ў агульных выразах аб непрызнаньні фактаў, што адбыліся, і ў якой не ўпамінаецца проста аб Манчжурыі. Склад рэдакцыйнага камітэту (Англія, Францыя, Чэха-Славакія, Гішпанія і Швэйцарыя) пакідае Англію ў меншасьці, паколькі Францыя хістаецца. У складзе рэдакцыйнага камітэту ў даны момант адбываецца барацьба. Найбольш вострым пытаньнем зьяўляецца праблема запрашэньня ПАЗШ і СССР і адносіны гэтых дзьвёх краін да падобнага запрашэньня. У кулюарах Лігі праводзяцца розныя, але прызнаньня намаганьні, накіраваньня ў бок прынцыпа гэтага запрашэньня. Для кіраўнікоў Лігі асабліва важным у даны момант зьяўляецца папярэдняе базы ўзьелыжкаў паспрэдніцтва і фармальнае ўскладаньне адказнасьці таксама на ПАЗШ і СССР.

Працэс 6-ці салдат у Пазнані

ВАРШАВА, 14. У акруговым судзе ў Быдгошчы адбыўся пачатычны працэс над 7 рэвалюцыйнымі рабочымі па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі. На лаве падсудных заселі: **Ян Альшэўскі, Зыгмунд Яворскі, Чэслаў Банкоўскі, Мар'я Яворская, Казімір Латонскі, Геранім Шуміньскі, Сьцяпан Паўліч.**

Прыгавораны: **Альшэўскі Ян на 10 год катаргі, Зыгмунт Яворскі і Чэслаў Банкоўскі па 5 год катаргі, Мар'я Яворская, Казімір Латонскі, Геранім Шуміньскі і Сьцяпан Паўліч — па два гады кожны.**

Аднячасова ў **Пазнанскім** акруговым судзе распачаўся суд над 6 салдатамі 57-га і 58-га пяхотных палкоў — Бюгам, Вабюкам, Сьмеганюком, Казорыпам, Фаскаю, і Турнікам. Усе 6 чал. абвінавачваюцца ў камуністычнай прапагандзе.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Перавыбары фабзаўмясцкомаў перанесены з 15 сьнежня на 1 студзеня 1933 г.

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі, у сувязі з неабходнасьцю стварэньня рашучага пералому ў выкананьні плянаў загатовак (збожжа, бульбы, ільну, мяса), справаздачна-перавыбарчую кампанію фабзаўмясцкомаў перанёс з 15 сьнежня 1932 году на 1-е студзеня 1933 году

Прапанавана ўсім прафарганізацыям разгарнуць шырокую масавую работу ў вёсцы вакол выкананьня плянаў загатовак за ўстаноўлены партыяй і ўрадам тэрмін, накіраваўшы для гэтага ў раёны ўвесь кіруючы прафактыў.

НОВЫ ДОМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў БАБРУЙСКУ

Да першага ўсебеларускага зьезду саюзу рабочых шофэраў

Над кіраўніцтвам камуністычнай партыі СССР пераможна завяршае першую пяцігодку за чатыры гады. Посьпехі грандыёзныя. Яны дасягнуты ўпартай барацьбой на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Вялікія посьпехі ёсьць і ў аўтамабілізацыі СССР. Калі ў старой царскай Расіі зусім ня было ўласных заводаў па будаўніцтве аўтамашын, дык зараз мы маем такія гіганты, як завод імя **Сталіна** ў Маскве, які выпускае каля 20.000 машын у год, завод імя **Молатава** — 18.000 аўтамашын у год, **Яраслаўскі завод** і інш.

Аўтамашына зараз перастала быць радкасьцю. Яна працуе ня толькі ў горадзе, але і па калгасных палёх, паскараючы ўборку ўраджаю і г. д.

У царскай Расіі налічвалася ўсяго 10 тыс. машын і 15.000 аўтаработнікаў, якія абслугоўвалі памешчыкаў і капіталістаў. У СССР ужо зараз ёсьць больш 50.000 аўтамашын (з якіх у БССР звыш 1.000) і каля 300.000 рабочых і служачых. У другой пяцігодцы гэтыя лічбы значна павялічацца. Выпуск аўтамашын нашымі аўтазаводамі будзе складаць 1.200 тыс., з якіх каля 45.000 машын паступіць у БССР. Такіх шпаркіх тэмпаў аўтамабілізацыі ня ведае ні адна капіталістычная краіна.

Высокі рост аўтамабільнага транспарту, рост колькасьці рабочых і служачых аўтагаспадарні ставіць перад прафэсыянальнай арганізацыяй адказьнейшыя задачы.

Выходзячы з таго, што існаваўшая структура саюзу мясцовага транспарту ня зможа забясьпечыць поўнасьцю запатрабаваньняў гігантска ўзрослага аўтамабільнага транспарту, УсеЦСПС паставіў рэарганізаваць саюз рабочых мясцовага транспарту ў саюз шофэраў (рабочых аўтамабільнага транспарту) з аб'яднаньнем у гэты саюз усіх аўтаработнікаў, незалежна ад таго, дзе яны працуюць. Да гэтага часу ва ўмовах БССР саюз мясцовага транспарту абслугоўваў усяго толькі каля 18 проц. усіх аўтаработнікаў. Рэшта-ж абслугоўвалася іншымі саюзамі. І зусім зразумела, што гэтыя саюзы не займаліся як належыць пытаньнямі падрыхтоўкі кадраў, пытаньнем перабудовы заработнай платы ў сэнсе ліквідацыі ўраўнілаўкі, не займаліся як належыць пытаньнямі барацьбы за павышэньне дысцыпліны і ліквідацыю аварыйнасьці.

Учора адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд нова - арганізаванага саюзу шофэраў. Зьезд павінен вызначыць канкрэтныя шляхі ўздыму прадукцыйнасьці работы машын, разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва паміж шофэрамі, наладжаньня палітвыхаваўчай работы сярод іх і перабудовы сыстэмы заработнай платы над кутом стымуляваньня росту прадукцыйнасьці працы і г. д. Вялікія задачы стаяць перад саюзам у справе падрыхтоўкі кадраў і павышэньня кваліфікацыі новых шофэраў. Трэба канчаткова дабіць абязьлічку ў аўтатранспарце шляхам пераходу на строеную язду. Неабходна давесьці эксплёатацыю машыны ў суткі ня менш 19 гадзін на адлегласьці 130 кілёмэтраў.

Перад саюзам стаіць задача ў самы бліжэйшы час дабіцца крутога пералому ва ўсёй рабоце.

Плікус.

Да 50-годзьдзя са дня сьмерці Карла Маркса

Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў для правядзеньня 50-годзьдзя сьмерці Карла Маркса выкучыла спэцыяльную камісію ў складзе акадэміка ПАНКЕВІЧА (старшыня), акадэміка ВОЛЬФСОНА і т. т. КРЫВІЦКАГА, ЛЕВІНА і ГІМЕЛЬФАРБА.

Першая ў БССР навукова-дасьледчая лябараторыя

Энэргетычная сэкцыя навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці БССР мантуе і абсталёўвае першую ў Беларусі навукова-дасьледчую лябараторыю, якая зойме ца палепшэньнем якасьці вады, апалу і аднаўленьнем адпрацаваных маслаў. Да гэтага часу БССР такой лябараторыі ня мела. Лябараторыя будзе мець вялікае значэньне ў сэнсе вышуканьня мэтадаў палепшэньня якасьці вады, якая ідзе для патрэб прамысловасьці, і павялічэньня каэфіцыенту карыснага дзеяньня апалу.

Лябараторыя ў бліжэйшыя дні прыступіць да навукова-дасьледчай работы.

Падручнікі—школам

Белдзяржкыдавецтва склала плян выпуску падручнікаў для школ на 1933 год. У параўнаньні з гэтым годам пік падручнікаў значна павялічваецца. Зэмест 52 назваў у 1932 годзе выпускаецца 61 назва: 25 для 1-га канцэнтру і 36 для старэйшага канцэнтру. Складзены брыгады аўтараў для выпуску падручнікаў.

Хроніка

*** 30 членаў віцебскага гарадзкога савету** накіраваны ў вёскі для дапамогі мясцовым арганізацыям у выкананьні пляну абожжа-загатовак і падрыхтоўкі да міжраённага кірмашу.

*** Месячнік барацьбы за якасьць** прадукцыі абвешчан на канцэнтэракаму камбінату «Спартак» у Гомелі.

*** Нова-Беліцкі завод «Чырвоны хэмік»** значна палепшаецца. На гэту мету адпушчана 972.000 руб.

*** Раённы зьлёт рэдэнтараў і рэдкапелій** насьцепшаеце скліканецца 15 сьнежня ў Асіповічах па пытаньні аб узмацненьні ўдзелу нізавога друку ў барацьбе за пасьпяховае выкананьне ўсіх гаспадарча - палітычных кампаній на вёсцы.

*** За разбазараньне дзяржаўнага збожжа,** млынар Савіцкага млыну, Бабруйскага раёну, П. Дуталь прыгавораны да пазбаўленьня волі ў папраўча-працоўных лягерах тэрмінам на 4 гады.

*** 19 сьнежня ў Дзяржтэатры** адбудзецца канцэрт вядомага піяніста М. Перэльмана і віяланчэліста Герца Цомік.

*** Па дагаворанасьці паміж Галоўсацтрастам і КСУ** пры СНК БССР прадастаўляецца на час перапынку ў ВНУ з 1 па 15 студзеня 120 месц для навуковых работнікаў у доме адпачынку «Ждановічы». Для лепшага культурнага абслугоўваньня навуковых працаўнікоў дом вучоных арганізуецца ў гэты час рад канцэртаў, кіно-сэансаў, дакладаў і інш.

*** Да 1 ліпеня 1933 г.** будзе скончана рэканструкцыя крэйдавага заводу ў Нова-Беліцы, Гомельскага раёну. Магутнасьць заводу павялічыцца да 500 тон крэйды ў год, замест 50 — 100 да рэканструкцыі.

Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для прапрацоўкі сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б на 17 сьнежня

Завод «Бальшавік» — дакладчык т. Конюхаў (АБВШ), «Камунар» — Каждан (ГК), зав. імя Варашылава — Башмачнікаў (ГК), імя Молатава — Васковіч (ЦК), ф-ка «Кастрычнік» — Хейфэц (газ. «Рабочий»), «8 сакавіка» — Дучец (газ. «Анцябр»), «Камунарка» — Рудніцкі (НКА), ф-ка імя Крупскай — Касьцюк (ГК), кушнерная ф-ка — Эпштэйн (Бімэз), зав. «Ударнік» — Канаплін, абутковая — Лур'е (ВКСГШ), гута — Лойко (ВКСГШ), шчотачная — Чыжоў (КІЖ), друкарня імя Сталіна — Агульнік (ВКСГШ), Масахамбінат — Вільчак (ЦК), ф-ка «Усход» — Малей (ГК), «Беларусь» — Вейтаў (ЦК), хэмфармзавод — Зярніцкі (КІЖ), зав. «Чырвоны хэмік» — Прышчапаў (№ АП), дражджавы завод «Пралетарыі» — Кулінковіч (Гістпарт), зав. «Чырвоная зорка» — Ошэраў (БАН), «Беларуская» — Капуцкі (Гістпарт), «Чырвоны тэкстыльшчык» — Масленкоў (буд. інстытут), шпалерная ф-ка — Грышанаў (№ КП), лямцавая ф-ка — Майзэль (Гістпарт), Эксплёатацыя — Ашаровіч (ЦК), электрастанцыя — Валодзьна (гарсавет), уціль скур—Ткачэнка (№ КП), групком харчавікоў — Верба (БКС), завод малочных кіслот — Зуськоў (Гістпарт), БСІКА — Львовіч (ВКСГШ), УЭА — Лейн (ВКСГШ), «Полымя рэвалюцыі — Шчэрбакоў (БАН), служба цягі — Краўчук (ВКСГШ), МРВ — Грыцкевіч (ГК), Саюзтранс — Шашукоў, транспартрэст — Турлай (ЦКК), яч. шляху — Жолудаў (ГКК), ДЗ-6 — Серафімаў (БАН), Белдзяржбуд — Гайдук (БДВ), Менбуд — Шастакоў («Сав. Беларусь»), Гержынсаюз — Гуровіч Цыля (ЦК), Наркамсабес — Падальніцкі (Гістпарт), УНР № 41 — Радзіцкі (ВКСГШ), УНР 18 — Іваноў (Гістпарт), дом Уралу — Дубіна (Белкіраўніцтва сувязі), Энэргабуд — Халасевіч (ГКК), 7-я дыстанцыя — Кунцэвіч (Буд. інстытут), Водаканалтрэст — Каранеўскі (гарсавет), цагельня № 1 — Немец (Гістпарт), цагельня № 2 — Снаблоў (БАН), цагельня № 3 — Бобрык (БАН), цагельня № 6 — Карнейчык (БАН), 1-шы групком будаўнікоў — Рагінская (БАН), зав. стандартных дамоў — Улазаў (ЦК), мод., дроў-хзм. прамсаюз — Гімельфарб (ВКСГШ), радыё-вузел — Окур (ВКСГШ), яч. міліцыі — Горын (БАН), аховы чыгункі — Праўда (КІЖ), пажарная ахова — Кучынскі (ВКСГШ), зав. ланцугоў «Галя» — Лысоў (энэрга-інстытут), трамвайны парк — Любін (ВКСГШ), дрэваапрацоўчая арцель — Левіт (зав. камаўз), хлебазавод — Керманевіч (ГК), ФЗ «КІМ» — Драпілаў (буд. інстытут), сьпіртзавод — Правіяльчыкаў (БДУ) попк ГПУ — Выдра (ВКСГШ), ф-ка «Уціль» — Гурло (плановаэканам. інстытут), арцель швэйнікаў «Пралетары» — Рымша (ГК), Камгастрэст — Ермакоў (БДУ).

Сакратаром партклентэтыву дагаварыцца выпучанымі дакладчыкамі наконт часу агульнага сходу на прадпрыемстве.

РЭЗЭРВ ДАКЛАДЧЫКАЎ ДЛЯ ГОРАДУ

Айзэнберг (ВКСГШ), Шнэйдэр (БАН), Крывіцкі (БАН), Дембаль (БАН), Зарэмбскі (БАН), Касьцілёў (ЦСПСБ), Кароль (ГК), Герцовіч (ВКСГШ), Квятнеўскі (НКА), Ліманоўскі (БАН), Халпяў (ВКСГШ), Шапіра (СНК), Судакоў (НКЮ), Рыўкін (НКЮ), Мар'ясіна (НКФ), Эгле (ЦК чыг.), Валабрынскі (БАН), Львовіч (ВКСГШ), Шпітальнік (КІЖ), Бэр («Анцябр»), Кабакоў («Акцябр»), Дамесак («Акцябр»), Пратасевіч (Падаўў), Камэнштэйн, Фрыд (рэдыёвузел), Пятровіч (Дзяржплан), Мацько (ЦК), Бітлін (ЦК), Фрыдлянд (ЦК), Старавойтаў (Гістпарт).

РЭЗЭРВ ДАКЛАДЧЫКАЎ ДЛЯ ВЁСКІ

Андрэйчык (ЦК), Курцін (ЦК), Асаўлян (ЦК), Каган (ЦК), Кавалёнка (ЦКК), Азаронак (ЦКК), Пасюкевіч (ЦКК), Сосінаў (газ. імя Варашылава), Тарасевіч («Камунар»), Жукаў (Бімэз) Спуцкі (ГК КСМ), Каган (ГК), Дабравольскі (НКА), Касьцюкіч (Наркамсобес), Фрапоў (Гістпарт), Памінетка (Наркамзем), Соколаў (Наркамзем), Мешкес (Наркамзем).

Паведамленьні

— МГК КП(б)Б разам з рэдакцыямі цэнтральных газэт на 18/XII-32 г. склікае раённы рабселькораўскі зьлёт, які адбудзецца ў гор. Менску, у памяшканьні клюбу імя К. Маркса (рог вул. К. Маркса і Энгельса) у 10 гадз. раніцы па пытаньнях: вынікі лістапада даўскага і сьнежаньскага пленумаў ГК і ЦК КП(б)Б і задачы нізавога друку. На зьлёце будзе арганізавана кансультацыя па наступных пытаньнях: аб уздыме ўраджайнасьці, аб разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах, формы і мэтады работы нізавога саўгасна-калгаснага друку і рабселькораў і інш. На нараду павінны зьявіцца: рэдактары і члены рэдкалегій саўгасна-калгасных і МТС насьценгазэт і рабселькоры, ячэйковыя парторгі па рабоце нізавога друку і рабселькораўскага руху. Сакратарам яч. КП(б)Б забясьпечыць своячасовую яўку ўдзельнікаў зьлёту.

— Менская рэспубліканская саўнартшкола запранае выкладчыкаў: па беларускай і расійскай мовах, па матэматыцы, прыродазнаўстве, вайсковай справе, клясавай барацьбе і палітычнай эканоміі. Падаць заявы у культпрэп ГК, пакой 24, сакратару культпрэпу, а пасьля 1-га студзеня—у клюб мэталістаў па Універсытэцкай вуліцы, канцылярыя клюбу.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр БАТІ
Сёньня Кузьма Чорны
БАЦЬКАЎШЧЫНА
Эпопея ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Савецкая, 28 тэл. 15-20
БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ
СЁНЬНЯ
КОНТР-АТАКА
Пастаноўка В. Я. Галаўчынера.
Мастак Дзяськіцкі.—Мантаж—музыка Клаўз і Гітліц.
Пачатак роўна ў 8 г. 30 м.
Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру.

10-ы ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ
ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ
жывёл і птушак.
Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзенна.
Па календарных заўтках прадстаўляецца 50 проц скідка. Зварачацца ў кантору зьвярынцу загадзя.

СПАРТАК Каса—ад 1 г. дня. Гароль Лёйд у замежн. фільме МАЛОДШЫ СЫН КАМЭДЫЯ Ў 8 ЧАСТКАХ
Інтэрнацыянал Каса—ад 12 г. дня. Мастацкі фільм У горадзе заходзіць кельга Звыш праграм.—Кінохроніка.
Пралетары Вячэрнія сэансы ПАТ І ПАТАШОН у камэдыі ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ Дзённыя дзіячыя сэансы БОЙКІ ЖЫЦЬЦЯ

Ф-ка школа ФЗВ імя „КІМ'у"
БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЯ
абвяшчае набор вучняў.
Прымаюцца падлеткі па ўзросьце ад 14 да 18 год з адукацыяй 4-5-6-7 груп семігодні.
Прыём заяў да 25 сьнежня г.г.
у памяшканьні ф-кі (Менск, Ленінская, 11) з 11 да 3 гадзін дня.
Да заяў прыкладаюцца дакументы: аб сац. становішчы, мэтрыку і аб адукацыі.
Адміністрацыя.

Інстытут філёзофіі АН БССР
— 16 сьнежня, у 6 гадз. веч. (пок. 10) адбудзецца працяг дакладу т. Гуверова— „Аб марксыцкім разуменьні разьвіцьця мастацкіх".
— 17 сьнежня, у 7 гадз. вечара (пак. 1?) адбудзецца пасяджэньне ін-ту філёзофіі. Парадок дня: „Д-р Д. т. Крайчыка—„Класавыя і матэдалягічныя карэньні люксэмбургізма".
Запрашаюцца жадаючыя.
Дырэкцыя ін-ту філёзофіі.

КІНО ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА
УСТРЭЧНЬ
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
У галоўных ролях:
Сямён Іваныч Бабчэнка—В. Гардзін.
Бабчыха—Нар. арт. Блюмэнталь-Тамарына.
Вася—Б. Тэпін.
Каця—Т. Гурэцкая.
Павел—Абрыносаў.
Інж. Скварноў—Б. Пасловускі.
Ягоная маці—Засл. арт. Ш. Бутоцкая.
Інж. Лазараў—И. Казлоўскі.
Чуточкін—Я. Гудкін і інш.
Вытворчасьць Ленінградзкай фабрыкі РОСФІЛЬМ.
СЛУХАЙЦЕ І ГЛЯДЗЕЦЕ ад 16 сьнежня і штодзённа
Рэжысёры: Ф. Эрмлер і С. Юткевіч.
Кампазытар: Д. Шастаковіч.
Гука-апаратары: І. Волк і І. Дзьмітрыеў.
ПЕСЬНЯ З ФІЛЬМУ „СУСТРЭЧНЫ"
На раньне ўсход ружавее
Ў тумане струменіць рака
Кучаравая, чаму-ж ты не рада
Вясёламу сьпеву гудка?
Ня сьпі, уставай, кучаравая,
У грохах і агні
Краіна ідзе са славаю
Насустрач дню.
Каб ня было вялікага наплыву, сэансы на карціну „Сустрэчны" пачынаюцца ад 2 гадз. дня.
Пачатак 1 сэансу ў 2 гадз. дня.
„ 2 „ „ 4 „ „
„ 3 „ „ 6 „ вечара.
„ 4 „ „ 8 „ „
„ 5 „ „ 10 „ „
Касы адкрыта з 12 г. дня.
Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы без чаргі.
Асобы, якія спозьняцца на сэанс, не дапускаюцца.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
19 сьнежня
толькі адзін аб'яднаны канцэрт
віяланчэліста ГЕРЦ ЦОМІК
і ўдзельніка сусьветнага конкурсу піяністаў імя Шопэна ў Варшаве у 1932 г.
піяніста НАТАНА ПЕРАЛЬМАН
Падрабязнасьці ў афішах.
Білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз. і ў касе тэатру.

Наркамасьветы 20-га сьнежня 1932 г. у Менску
скліканецца
ўсебеларуская нарада-канфэрэнцыя культпалітасьветных працаўнікоў:
Райінспэктараў палітасьветы, загадчыкаў райдомаў культуры, сельскіх домаў культуры і культ. працаўнікоў 5-ці МТС.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Разьвіваньне пастаноў ЦК КП(б)Б, СНК і камітэту НКА аб масавай культпалітасьветнай рабоце (дакл. т. Рудніцкі).
2. Мерапрыемствы па рэалізацыі пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб агрэвоатэхпрапагандзе і падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі (дакл. НКЗ).
3. Удзел культпалітасьвет. устаноў у кабілізацыі сродкаў (дакл. НКФ).
4. Аб ходзе ўсенавучу і ліквідацыі зу (дакл. т. Захарык).
Нарада адбудзецца ў 12 гадз. дня.
Прадпісваецца усім райАНА забясьпечыць яўку на нараду згодна даній разьвярстцы.
Наркамасьветы.

19 СЬНЕЖНЯ,
у 6 гадз. веч., у клюбе Мэдсанпрацы (Рэвалюц., 2)
адбудзецца
3-ці Пленум ЦП Саюзу мэдсанпрацы
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Выніні 2-га Пленуму УсеЦСПС (Дакл. старш. ЦСПСБ т. КАВАЛЬЧУКА).
2. Даклады нізавых арганізацый аб перабудове прафработы на аснове рашэньняў IX-га зьезду прафсаюзаў (Менск—клінічны гарадок; Гомель—Гарадзкі Адзіны Дыспансэр; Віцебск—больніца; Дзяржынск—райком саюзу; Горкі—райком саюзу; Пухавічы—райком саюзу.
3. Кантрольныя лічбы Аховы Здароўя на 1933 год (дакл. НКАЗ).
4. Даклад аб выніках сустрэчнага плянаваньня ЦП саюзу МСП (Пл.-выт. адз. ЦПС МСП т. ЗАКСА).
Запрашаюцца ўвесь прафактыў і мэдпрамаўнікі для прыняцьця ўдзелу ў працы пленуму.
Прэзыдыум ЦП Саюзу мэдсанпрацы.

АБ'ЯВА
За няўплату плянавай пазыкі ў вызначаны тэрмін,
БАБРУЙСКІМ АДДЗЯЛЕНЬНЕМ ДЗЯРЖБАНКУ
ПРАДАЕЦЦА 2000 тон паліўнога торфу,
які належыць торфарцелі „Прагрэс", Кавалеўскага с.-с.
Торф знаходзіцца на адлегласьці 1 кл. ад станцыі Цялуша.
БАНК.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б І МЕНГАРСАВЕТ
18 сьнежня у 10 гадз. раніцы, у клюбе Менгарсавету (пляц Волі № 4)
СКЛІКАЮЦЬ канфэрэнцыю жанчын калгасьніц і работніц саўгасаў.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Аб разьмеркаваньні даходаў калгасаў і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.
2) Аб ходзе выкананьня ўсіх відаў загатовак.
Сакратары сельпартячэек і старшыні сельсаветаў Менрайону павінны забясьпечыць своячасовую яўку выбраных дэлегатак на канфэрэнцыю.
МЕНГАРКОМ КП(б)Б
МЕНГАРСАВЕТ.

Менск друкарня «Зьвязда». Галоўлітбел № 336